ДУА
«ЕЛКАЎСКАЯ
СЯРЭДНЯЯ
ШКОЛА»

# РЭХА ШКОЛЬНАГА ЖЫЦЦЯ

Агульнашкольная газета Кастрычнік 2021 Выпуск №10

У гэтым нумары:


1 кастрычіка — дзень пажылых людей 1

Поздравля-ем педагогов 2

Неделя Матери 3

Прыкметы аб надвор'і у кастрычніку 4


## 1 кастрычіка— дзень пажылых людей

Старасць называюць залатым часам, і восень, як вядома, таксама называюць залатой парой. Можа, таму ў самы разгар восеньскага сезона 1 кастрычніка ва ўсім свеце адзначаецца Дзень пажылога чалавека. На думку Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, да "пажылых" адносяцца людзі ва ўзросце 60-80 гадоў.



Сёлета свет святкаваў ужо 28-ы Дзень пажылога чалавека, наша краіна — 26-ы. У Беларусі Дзень пажылых людзей адзначаецца з 1992 года.



Дзень пажылых людзей - гэта напамін пра тое, што трэба з разуменнем і павагай ставіцца да старэйшага пакалення.
Гэтае свята вельмі важнае сёння, бо яно дазваляе прыцягнуць увагу да шматлікіх праблемаў пажылых людзей.
Вучні нашай школы заўсёды памятаюць аб патрэбах пажылых людзей і сістэматычна аказваюць ім дапамогу, каб зрабіць іх жыццё лепшым, напоўніць яго цяплом і святлом.

Аўтар: Галонская М.

# Поздравляем педагогов

В день осенний, когда у порога
Задышали уже холода,
Школа празднует День педагога,
Праздник мудрости, знаний, труда.
День учителя! Вслушайтесь сердцем
В эти звуки, что дороги нам.
Всем, что связано с юностью, детством,
Мы обязаны учителям!

Ученики размышляют. Идеальный учитель…

- ⇒ вежливый, спокойный;
- ⇒ добрый, умный;
- ⇒ ответственный;
- ⇒ сдержанный;
- ⇒ найдёт выход из любой ситуации;
- ⇒ терпеливый, справедливый;
- ⇒ любящий детей;
- ⇒ на уроке которого тишина, потому что интересно;
- ⇒ общительный, с чувством юмора.

Именно такие учителя работают в нашей школе !



Это интересно

Как называют учителей
в разных странах?
По-английски - тича
По-немецки - лэрэр
По-японски - сэнсэй
По-французски - лёсиньо

Аўтар: Чак М.

# Неделя Матери

С 11п о 15 октября в школе прошла Неделя Матери. Ребята порадовали своих мам отличными оценками, стихами, трогательными песнями о маме .




Мама…

Слов дороже нет на свете!

По какой бы ты не шёл тропе,

Мамина любовь над нею светит,

Чтобы в трудный час помочь тебе.

Мама озаряет сердцем нежным

Дни, дороги и дела твои.

Оправдай же мамины надежды-

Повседневно лишь добро твори!

Аўтар: Салаўёва М.

# Прыкметы аб надвор'і ў кастрычніку



***У кастрычніку і хата з дрывамі, і мужык з лапцямі.***
***Кастрычнік ходзіць па краю і гоніць птушак з гаю.***
***Кастрычнік ні калёс, ні палоз не любіць.***
***Кастрычнік зямлю беліць, а лес дык залоціць.***

Кастрычнік - дзясяты месяц года. Беларуская назва месяца паходзіць ад слова"кастрыца": у гэты час сяляне трапалі, часалі лён і каноплі, з якіх ападала шмат кастрыцы. Кастрычнік характарызуецца зменлівым надвор\`ем: бываюць густыя туманы, слата, частыя замаразкі, а часам выпадае і снег. Дрэвы стаяць аголеныя, птушкі адляцелі ў вырай.

Прыкметы:

- Калі лісце з бярозы і дуба ападае нячыста, значыць, зіма будзе суровай. У тым выпадку, калі гэтыя дрэвы стаяць голымі, то год будзе лёгкім.
- Калі лісце з дрэў падае тварам дагары — гэта прадвеснік дрэннага ўраджаю ў наступным годзе.
- Пачуць гром у кастрычніку — чакаць зімы без снегу. Калі шмат арэхаў, а грыбоў няма, то зіма будзе снежная і суровая.
- Калі ў канцы кастрычніка ўдалося знайсці грыбы — гэта ўказанне, што снег выпадзе няхутка.

Аўтар: Цітоў П.